*Смолік А.І.*
*БДУКІ, Мінск*

# ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ М. К. АГІНСКАГА – УЗОР АДДАНАГА СЛУЖЭННЯ РАДЗІМЕ

Актывізацыя інтарэсу і звароту да духоўнай культуры элітарнай часткі супольнасці мінулых стагоддзяў дэманструе якасна новы ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. На дадзеным этапе культурагенезу адбываецца трансмісія ўзораў культуры беларускай арыстакратыі і вяртанне яе ў сучасную сацякультурную прастору. Гэта, на наш погляд, вельмі важна, так як ва ўмовах сацыяльных рэвалюцый і сацыялістычных пераўтварэнняў была страчана пераемнасць традыцый элітарнасці. У свядомасць савецкіх людзей насаджалася перакананне, што рухаючай сілай грамадства з'яўляюцца масы, а не асоба. У той жа час заснавальнікі тэорыі эліт В. Парэта [5], Г. Моска [4] и Р. Міхельс [3] пераканаўча паказалі, што эліта ажыццяўляе выпрацоўку ідэй, стратэгіі развіцця грамадства, адыгрывае вызначальную ролю ў палітыцы, эканоміцы і культуры.

У працэсе сацыягенэза на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў перыяд з XV–XIX стст. сфарміравалася праслойка палітычнай і культурнай эліты, якая значна ўплывала на сацыяльна-палітычнае і мастацка-творчае жыццё еўрапейскіх краін. Заметны след у палітычным і культурным жыцці ВКЛ, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі пакінулі прадстаўнікі графскага роду Агінскіх. Цікавасць мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў, краязнаўцаў да асоб нашчадкаў княскага роду Агінскіх актывізавалася ў апошнія гады,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

напярэдадні 250-годдзя з дня народзін Міхала Клеафаса. Юбілей Агінскага будзе шырока адзначацца ў гэтым годзе не толькі ў Беларусі, але і ў Літве, Польшчы, Італіі, Францыі і іншых краінах свету. ЮНЕСКА аб'явіла 2015 год годам М.К. Агінскага ў знак прызнання яго заслуг перад сусветнай супольнасцю. Іх палітычная, эканамічная і культуратворчая дзейнасць займае сёння значнае месца ў даследаваннях беларускіх, італьянскіх, літоўскіх, польскіх, расійскіх вучоных. Асабліва грунтоўна даследуецца мастацка-творчая дзейнасць Міхала Клеафаса Агінскага. Так сталася, што ў шматлікай гістарычнай і мемуарнай літаратуры дадзеная постаць падаецца аднабока. Граф М.К. Агінскі (1765–1833 гг.) ў ёй паўстае ў асноўным як кампазітар, які стварыў шэраг цудоўных музычных твораў добра вядомы беларусам, у тым ліку і шэрагу любімых і ў наш час паланэзаў. У Беларусі і Літве апублікавана некалькі манаграфій, шэраг навуковых артыкулаў, у якіх пераважна асвятляецца мастацка-творчая і культурна-асветная дзейнасць М. Агінскага. Але даследаванне яго жыццёвага і творчага шляху сведчыць, што князь быў знакамітым прадстаўніком не толькі творчай, але палітычнай і эканамічнай эліты. Аналіз жыцця і творчасці Агінскага сведчыць, што вызначальны ўплыў на фарміраванне яго ўнутранага духоўнага жыцця аказала канцэпцыя рамантызму.

Міхал Клеафас у маладым узросце пад кіраўніцтвам прадстаўніка французскага рамантызму Жана Ралея атрымаў грунтоўную рознабаковую адукацыю. Шчыры і добры настаўнік, якім быў Ж. Ралей, дапамог юнаку засвоіць важнейшыя палажэнні філасофіі рамантызму, прынцыпамі якога на працягу ўсяго жыцця кіраваўся Міхал Клеафас. У сваіх мемуарах М. Агінскі пісаў: «Мой настаўнік удыхаў у мяне ідэі свабоды, якія грунтаваліся на ідэях хрысціянства, што прымушала глядзець на чалавека як на брата» [1, с. 43]. Для рамантыка Агінскага было характэрна абвостранае пачуццё ўласнай суб'ектыўнасці, якое не знаходзіць ні ў чым поўнага самаажыццяўлення, жаданне вярнуць сабе страчаны некалі стан шчасця і пакою, сум па дасканаламу, якому няма месца ў рэальным жыцці і якое наогул не мае ніякіх пэўных абрысаў. Ідэя творчасці, ствараемага жыцця – цэнтральная ў карціне свету Міхала Клеафаса. Творчая філасофія, якой ён прытрымліваліваўся, вынікала з ідэі свабоды і веры ў яе, з ідэі, што чалавечы дух дыктуе свае законы ўсяму існаму. Зыходзячы з гэтага прынцыпу, М. Агінскі як, дарэчы, і большасць прадстаўнікоў княскага роду аддана служылі сваёй Радзіме, абаранялі яе незалежнасць і суверэнітэт, годна прадстаўлялі сваю краіну сусветнай супольнасці. Так, ён у 1780-я гады быў надзвычайным пaслом у Галандыі, выконваў сакрэтную дыпламатычную місію ў Лондане. На туманным Альбіёне граф быў прадстаўлены каралю Георгію III, меў з ім і каралевай гутарку. Там жа ён сустракаўся з герцагамі ўэльскім, йорскім і кларэнскім, з прэм'ер-міністрам Уільямам Пітам, з якімі абмяркоўваў дыпламатычныя пытанні.

Граф таксама сумленна выконваў абавязкі на шэрагу іншых высокіх дзяржаўных пасад. Так, у 1876 г. ён быў абраны ад Трокскага ваяводства на сойм Рэчы Паспалітай, дэпутаты якога ўвялі Міхала Агінскага ў склад скарбовай камісіі ВКЛ. Функцыі скарбовага ўпаўнаважанага яму давялося выконваць у Гародні. Да сваіх абавязкаў граф адносіўся вельмі адказна. За кароткі час ён здолеў праверыць усе мытныя пасты на мяжы Літвы з Расіяй – ад Палангі да Берасця і выявіць шмат злоўжыванняў. Там жа ў Гародні, падчас працы ў Камісіі скарбу М.К. Агінскі публічна выкрыў незаконныя дзеянні чыноўнікаў у справе вырабу новых медных манет, якія рабіліся па тайным распараджэнні расійскага пасла. У аўтабіяграфіі граф напіша аб сваёй службе ў якасці скарбовага ўпаўнаважанага наступнае: «Калегі, сярод якіх я быў самы малодшы, заўважылі ў мяне шмат стараннасці і актыўнасці і нагружалі мяне працай, ад якой я адчуваў вялікае задавальненне» [1, с. 45].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адданасць сваёй Айчыне, гатоўнасць дзеля яе свабоды ахвяраваць маёнткамі і нават уласным жыццём яскрава праявіліся падчас барацьбы супраць падзелу Рэчы Паспалітай. М. Агінскі рашуча змагаўся з магнатамі, якія стварылі ў 1792 г. прарасійскі саюз (Таргавіцкую канфедэрацыю) з мэтай знішчэння прагрэсіўных рэформ Чатырохгадовага сойму і адмены Канстытуцыі 1791 г. Пры вялізарнай ваеннай, фінансавай і дыпламатычнай падтрымцы дэпутатаў дадзенага саюза з боку Расійскай імперыі М. Агінскі і яго паплечнікі пацярпелі паражэнне. У выніку чаго адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай. Большасць шляхты, каб захаваць свае маёнткі і атрымаць належны чын ад расійскай улады, прысягнулі на вернасць імператрыцы Кацярыне II. М. Клеафас не паступіўся сваімі прынцыпамі і адмовіўся прысягаць імператрыцы, за што над ім навісла пагроза жыццю. Каб выратаваць сябе і сваіх блізкіх, мужны патрыёт вымушаны быў эмігрыраваць у Прусію. Яго маёнткі былі канфіскаваны новай уладай.

У 1794 г. расійскія ўлады сумесна з Аўстра-Венгрыяй і Прусіяй распачалі актыўную дзейнасць па канчатковаму знішчэнню дзяржаўнасці ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Патрыятычна настроеная шляхта пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі пачала фарміраваць паўстанцкія атрады з мэтай захавння незалежнай дзяржавы, на тэрыторыі, яшчэ не захопленай акупантамі. М. Агінскі без ваганняў далучыўся да паўстанцаў. На патрэбы паўстання ён ахвяраваў 188 тыс. злотых. На гэтыя сродкі ён сфарміраваў батальён стралкоў колькасцю 480 чалавек і ўзначаліў яго. Камандзір і яго стралкі мужна змагаліся супраць прускіх і расійскіх узброенных фарміраванняў. Атрад Агінскага вызначыўся ў бітве пад Дынабургам (Даўгаўпілс), у баях на подступах да Мінскай губерні, куды паўстанцы прабіваліся, каб падняць паўстанне і там. У адной з сутычак з царскім войскам ён ледзь не загінуў. Каб падтрымаць адзіны і ўсеахопны дух паўстанцаў, М. Агінскі стварае шэраг маршаў і баявых песен, з якімі стралкі ішлі ў няроўную бітву з сваімі ворагамі. Асабліва шырока вядомым сярод касцюшкаўцаў быў «Марш паўстанцаў 1794 года». Але супрацьстаяць аб'яднаным аўстра-венгерскім, прускім і расійскім рэгулярным арміям было немагчыма. Пасля падаўлення паўстання зноў М. Агінскага чакала развітанне з горача любімай ім Радзімай. Восем гадоў ён жыве ўдалечыні ад сваёй Айчыны: Аўстрыя, Італія, Францыя.

У 1802 г. дзякуючы намаганням князя А. Чартарыйскага М. Агінскаму ўдалося атрымаць ад Аляксандра I дазвол на вяртанне на Радзіму і на валоданне секвестраванымі маёнткамі. Паміж графам і імператарам устанавіліся прыязныя адносіны. У 1810 г. яму быў нават нададзены чын тайнага саветніка і званне сенатара, а таксама ад цара атрыманы ордэны Св. Уладзіміра і Аляксандра Неўскага. Але думка аб страчанай дзяржаўнасці, свабодзе народа ні на хвіліну не пакідала Агінскага, які імкнецца знайсці спосаб ужо шляхам рэформ аднавіць ВКЛ. Падчас сустрэч з Аляксандрам I у Пецярбургу, Вільні, Віцебску, Магілёве граф асцярожна выказвае свае меркаванні аб магчымасці ўсталявання ў межах Расійскай імперыі літоўскай аўтаноміі. М. Агінскаму ўдалося пераканаць цара ў неабходнасці лібералізацыі палітыкі ў заходніх губернях імперыі. Падчас сустрэчы сенатара Агінскага з імператарам у красакавіку 1811 г. Аляксандр I ухваліў яго прапанову і даручыў прадставіць пісьмовы праект. Разам з сваімі апантанымі паплечнікамі Т. Ваўжэцкім, Л. Плятэрам, Ф. К. Любецкім і інш. сентар ўзяўся за распрацоўку праекта аднаўлення ВКЛ. У маі 1811 г. была падрыхтавана памятная запіска цару, у якой і выкладаліся асноўныя палажэнні названага плана. У запісцы Агінскі так абгрунтоўваў неабходнасць аднаўлення беларускай дзяржавы: «Я перакананы, што калі б з часу далучэння да Расіі забраных польскіх зямель была з іх утворана адна правінцыя, захавана імя Літва і пакінуты яе даўніяі правы і каб з яе быў утвораны асобны край са сваім кіраўніцтвам, дзяржава ў складзе Расійскай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

імперыі, то тады іншаземны ўплыў пранікаў бы туды з цяжкасцю» [2, с. 27–28]. У пачатку 1812 г. палажэнні плана былі прадстаўлены больш дэталёва ў праекце канстытуцыі ВКЛ. Праектам прадугледжвалася, што з тэрыторый Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай, Валынскай губерній, Беластоцкай вобласці і Тарнопальскай акругі будзе ўтворана правінцыя пад назвай ВКЛ і кіраваннем намесніка імператара, з галоўным горадам Вільняй. Аўтары праекта лічылі неабходным прызнаць Сатут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. асноўным грамадзянскім законам. Прадугледжвалася, што замяшчаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ будуць толькі яго ўраджэнцы. Выказваліся меркаванні аб адмене прыгоннага права сялян у адноўленай дзяржаве і шэраг прапаноў, скіраваных на развіццё адукацыі і культуры. Але прагрэсіўны план Агінскага выклікаў перапалох у кансерватыўнай частцы расійскага ўрада, якая ўбачыла ў ім спробу расчлянення і аслаблення Расіі напярэдадні вайны 1812 г. Пад націскам шавіністаў імператар вясной 1812 г. фактычна адмовіўся ад ідэі аднаўлення ВКЛ. Нягледзячы на няўдачу з рэалізацыяй плана, сенатару Агінскаму ўдалося дабіцца ад імператара пэўных ільгот для Паўночна-Заходняга краю. Урадам было выдадзена шэраг законаў аб падатковых ільготах, дазвалялася ствараць губернскія шляхецкія камітэты, якія надзяляліся асобнымі функцыямі органаў мясцовага кіравання.

Як моц яго магла, М. Агінскі клапаціўся аб квітненні нашага краю, значную колькасць уласных сродкаў ён ахвяраваў на развіццё адукацыі, падтрымку таленавітых асоб. Будучы сябрам Таварыства дабрачыннасці, граф падтрымліваў цесныя сувязі з навукоўцамі Віленскага універсітэта, удзельнічаў у паседжаннях вучонай рады, аказваў універсітэту фінансавую падтрымку. У тагачасным рэестры маёмасці ВНУ значацца два мікраскопы і тэлескоп, якія падараваў універсітэту М. Агінскі. Дакументы сведчаць аб цесных стасунках мецэната з рэктарам унівесітэта – матэматыкам, філосафам і астраномам Я. Снядзецкім, яго братам, прафесарам хіміі і медыцыны А. Снядзецкім, прафесарам натуральнай гісторыі і батанікі С. Б. Юндзілам, прафесарам архітэктуры М. Шульцам, прафесарам медыцыны Ё.Франкам.

Значныя сродкі выдзяляліся М. Агінскім на падтрымку Маладзечненскага шляхецкага павятовага вучылішча. Так, у 1814 г. ён ахвяраваў вучылішчу вялікі збор кніг, фізічных і музычных інструментаў, нотаў. Сродкі граф выдаткоўваў на аказанне дапамогі беднаце. Так, Міхал Клеафас пабудаваў дом для бедных у г. Маладзечна. У сваіх успамінах «У Вільні і літоўскіх сядзібах» Габрыэля Пузыніна адзначала, што на хрэсьбінах сына ў Залессі частавалася каля 3-х тыс. сялян. Сваім дзецям ён наказваў прыязна адносіцца да сваіх слуг і прыгонных сялян. Гэтага наказа бацькі ўсё жыццё прытрымліваўся яго сын Ірэніюш, які ў сваім маёнтку ў Рэтава (Літва) адмяніў прыгоннае права, замяніўшы яго падаткам.

У віленскім палацы М. Агінскага часта збіраліся вядомыя прадстаўнікі палітычнай эліты Рэчы Паспалітай: А. Чартарыйскі, А. Тызенгаўз, Ю. Сулістроўскі, А. Прозар, Т. Ваўжэцкі, М. Ромер, С. Валовіч, Л. Плятэр, Д. Радзівіл. Падчас гэтых сустрэч, як сведчасць дакументы, абмяркоўваліся важнейшыя праблемы эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця краіны.

М. К. Агінскі ганарыўся сваёй прыналежнасцю да беларускага народа, высока цаніў яго духоўныя каштоўнасці, на самых высокіх прыступках свецкай і духоўнай улады адзначаў высокія маральныя якасці беларусаў. У запісцы да Аляксандра I ён пісаў, што жыхары Літвы «спрадвеку вылучаліся ваяўнічым духам, клапаціліся пра свае правы і былі верныя сваім манархам, адзначаліся мужнасцю і любоўю да Бацькаўшчыны. Гордыя сваім паходжаннем, літвіны, нягледзячы на аб'яднанне сваёй правінцыі з Польшчай, захавалі свае звычаі, свой грамадзянскі кодэкс, мясцовае кіраванне... Усе гэтыя прывілеі былі такімі дарагімі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для літвінаў, што, нягледзячы на ўсякія намаганні і красамоўныя адгаворы, немагчыма было схіліць літвінаў адмовіцца ад сваіх прывілеяў» [2, с. 27]. Даследаванне творчай спадчыны М.К. Агінскага паказвае, што яго духоўны свет, каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі і лад жыцця, высакароднасць, арыстакратычны кодэкс гонару, рэлігійнасць, адукаванасць, каштоўнасць свабоды, улады, закону могуць быць узорам для беларускай моладзі, садзейнічаць умацаванню яе маральных асноў.

**Літаратура:**


1. Верамейчык, С.І. Міхал Клеафас Агінскі, 1765–1833; продкі, жыццё ў Залессі, нашчадкі (спроба храналогіі)/С.І.Верамейчык. – Мінск: Кавалер, 2008. – 128 с.: іл.
2. Міхал Клеафас Агінскі (1865–1833)//Літаратура Беларусі XIX стагоддзя: анталогія/укл.: К.А. Цвірка, І.С. Шпакоўскі, К.У. Антановіч, навук. рэд. А.В. Мальдзіс. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – С. 27–28.
3. Михельс, Р. Социология политических партий в условиях демократии/Р. Михельс//Диалог. – 1990.–№ 3. – С. 13–28.
4. Моска, Г. Правящий класс/Г. Моска//Социологические исследования. – 1994. – № 12. – С. 97–117.
5. Парето, В. Трансформация демократии/В. Парето//Западно-европейская социология XIX – начала XX веков/Сост. В.П. Трошкина. – М.: Международный ун-т бизнеса и управления, 1996. – 515 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ